# Веснік Камароўкі

www.kamarouka.net – Найважнейшыя раённыя навіны №28(2) травень 2008

## ЧТО БЫЛО НА МЕСЦЫ КАМАРОЎКІ 100 ГОД ТАМУ?

На месцы цяперашняй плошчы Я.Коласа, вуліц Кульман, Гікала ды Харужай сто год таму месцілася вёска Камароўка. Быў гэта самы канец горада, за якім пачынаўся лес ды балоцістыя мясціны. Менавіта тут у 1911, за часамі Расійскай імперыі, адчынілася Балотная станцыя – адзін з цэнтраў вывучэння балотаў.

Праўдападобна, назва вёскі Камароўка пайшла ад вялікай колькасці камароў, што панавала над балоцістай мясцовасцю. Паступова назва вёскі пашыралася і на ўсю акругу.

Існуе, праўда й іншая версія назвы, гісторыя якой сягае ў сівую даўніну, а менавіта ў XV ст. Паводле яе, назва паходзіць ад імя жабрака Федзькі Камара. Збіраючы міласціну ля Мікалаеўскага храма, ён заўважыў, як па дарозе памёр чалавек з брудным мехам. Схапіўшы мех ды схаваўшыся ў блізкім лесе, Камар знайшоў у ім золата, але пакваліўшыся на скарб, ён мімаволі патануў у балоце...

Пасля дажджоў прылеглыя вуліцы ператвараліся ў непралазнае балота. У 1898 г. газета "Паўночна - Заходняе слова" пісала: "Паўз Камароўку штодня праходзіць да ста вазоў з дровамі ды іншым начыннем, і ўсё гэта валакуць ледзь ні на руках. Артылерыйскія цялегі часта вышэй за колы грузнуць у брудзе, уначы на ўсю Камароўку няма ніводнага ліхтара; адзін толькі агонь казённай лаўкі асвятляе ўночы вуліцу... Жыхары, пераважна бедны люд, неаднакроць звярталіся аб брукаванні Камароўкі, але беспаспяхова..."

Праз 9 год становішча не змянілася, як бачым з нумару "Мінскага лісткa" 1907 года: "Цяжка ўявіць што-небудзь болей жахлівае за нашую Захар'еўскую вуліцу, якая за Залатой горкай завецца Камароўка... Вуліца гэтая – адзінае грузкае балота, прайсці паўз яго ніякім чынам няможна".

Адзін мясцовы паэт нават прысвяціў Камароўке такі верш:

"Он рано вечным сном уснул,
Он жить хотел, но жил
по-свински.
В грязи несчастный утонул
На Комаровке,
в славном Минске".

Камароўка была занядбалым працоўным кварталам старога Менску, дзе ў жудасных жылі дробныя рамеснікі ды чорнаработнікі. Шмат хто з жыхароў свайго жытла ня меў і здымаў які-небудзь "кут"; часам у адным пакоі жылі дзве-тры сям'і.

Пітная вада ў калодзежах была вельмі дрэннай якасці.Ня дзіўна, што Камароўка стала адным з распаўсюднікаў інфекцыйных хваробаў у горадзе.

Адміністрацыйны статус раёна Камароўка атрымала ў 1938 ды пачала насіць імя ў гонар Варашылава. Таго самага, з блізкіх паплечнікаў Сталіна, які выступаў за жорсткія рэпрэсіі нявінных людзей і за смяротнае пакаранне малагадовым дзецям "ворагаў народа". Ад 1961 г. раён носіць імя Савецкага.

Так, 100 год таму тут быў глухі камарыны закуток. Але гэта частка нашай гісторыі, якая мусіць стаць важным аргументам на наданне раёну назвы Камароўскага.

**Наста УЛЕВІЧ**

## ЦЕНТРИЗБИРКОМ ОПАСАЕТСЯ БОЙКОТА ВЫБОРОВ

"Игнорируя выборы, политические партии отказываются от выполнения своей главной цели – завоевания власти",– заявил в интервью БелаПАН секретарь Центризбиркома Николай Лозовик.

"Главная цель любой политической партии – завоевание и осуществление власти. Это политологическая истина", – подчеркнул он.

По его словам, "законным путем власть можно завоевать только через выборы, остальные пути – незаконны". "Поэтому если политические партии не участвуют в выборах, бойкотируют их, то они, по сути, отказываются от своей главной цели", – отметил секретарь Центризбиркома.

По всей видимости, Центризбирком опасается массового бойкота парламентских выборов. Недавно именно с таким предложением представители гражданского общества обратились к демократическим силам в связи с усилением в стране политических репрессий, нежеланием властей идти на либерализацию избирательного законодательства, а также с тем, что с 1996 года все выборы и референдумы в Беларуси были признаны международными организациями несвободными и недемократическими.

К тому же, как стало "Народной воле", для европейских экспертов БДИПЧ/ОБСЕ неожиданным стало пожелание белорусского ЦИК, чтобы рабочим языком миссии был русский. Как заявил секретарь Н. Лозовик во время встречи с руководителем Офиса ОБСЕ в Минске Ханса-Йохана Шмидта, предложение мотивировано тем, что белорусская сторона хочет, чтобы "работа миссии была открытой и транспарентной и исключала секретность."

Прокомментировать позицию белорусской стороны "Народная воля" попросила Мечеслава Гриба, который имеет большой опыт проведения независимого наблюдения за выборами.

– Это очень необычное пожелание, сказал М. Гриб – У меня возникает вопрос: а почему выбран русский язык, а не белорусский? Ведь даже по нынешней Конституции первым государственным языком в нашей стране все-таки является белорусский.

Если говорить серьезно, то это нонсенс, такого я не встречал за всю свою практику. Международные наблюдатели во всем мире имеют переводчиков, и никаких сложностей и языковых барьеров не возникает. Вероятно, ЦИК всеми силами пытается ограничить количество международных наблюдателей, которые приедут на выборы, и потому выставляет языковой барьер. Ведь это белорусов можно выставить с избирательного участка, арестовать, оштрафовать, с международными наблюдателями белорусским официальным лицам общаться сложнее. Поэтому и ведется поиск разнообразных обходных путей. Но я все-таки надеюсь, что пожелание белорусской стороны не станет требованием. И в ОБСЕ его могут принять к сведению, но не исполнить.

Напомним, что осенью 2008 года в Беларуси должны пройти парламентские выборы.




**charter97.org**

## С белорусских рынков исчезли дешевые товары из Украины

С середины мая беларуские таможенники стали работать по новым рекомендациям. Теперь, если в туристе заподозрят челночника, его вещи могут пересчитать.

А когда ездишь за границу раз в неделю, можно привезти в Беларусь всего 1 новую кофточку, 1 маечку, 1 джинсы – не больше 3 вещей. Больше всего от новых правил пострадали челноки, которые возили товар из украинского Хмельницкого.

Впрочем, в Хмельницкий уже долгое время с разных городов страны ездили белорусы, чтобы закупиться одеждой или прочими товарами и для личных нужд, ведь цены на рынке в Хмльницком в несколько раз ниже, чем в Беларуси.

Теперь возле "Импульса" почти нет торговок с разнообразным товаром. Безлюдно и на ступеньках возле рынка "Ракаўскі кірмаш", нет нелегальных торговцев и в переходе на станции метро "Пушкинская". На "Западном" рынке вся одежда из России и Гродно.

**Андрей ГУДОВИЧ**

## Каля 50 тысяч мінчукоў не хочуць ставіць лічыльнікі вады

Каля 50 тысяч жыхароў беларускай сталіцы не хочуць ставіць лічыльнікі вады ў сваіх кватэрах. Пра гэта заявіў дырэктар Мінскай гарадской жыллёвай гаспадаркі Віктар Віраб'ёў.

Паводле яго словаў, сярод асноўных прычын на першым месцы – капітальны рамонт дамоў. 17 тысяч чалавек спадзяюцца, што з-за гэтага лічыльнікі ім паставяць бясплатна.

Столькі ж людзей спасылаюцца на адсутнасць сродкаў. Каля 10 тысяч чалавек ніяк не аргументуюць сваю адмову, інфармуе агенцтва "Мінск-навіны".